УДК 1 (091)

***В.Б. Евароўскі***

# МЕТАТЭОРЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ФІЛАСОФІІ БЕЛАРУСІ*

У артыкуле абагульняюцца вынікі даследаванняў па стварэнні агульнай тэорыі (метатэорыі) нацыянальнай філасофіі Беларусі. У сучасных умовах гэтая галіна гуманітарнай навукі ўяўляе сабою дысцыплінарна афармлены феномен, які мае грамадскае прызнанне, традыцыі даследавання, сваё ўласнае прадметнае поле – «Гісторыя філасофіі Беларусі», метадалогію і практыкі даследавання. Такім чынам, на позву дня ўстае пытанне канцэптуальнага апісання той формы прырашчэння ведаў, якое прапануе гэтая дысцыпліна. Мяркуецца, што вызначэнне сутнасці, разуменне структуры дысцыпліны, абагульненне практык атрымання ведаў і будуць найважнымі элементамі гэтай метатэорыі. Таму «нацыянальная філасофія Беларусі» – гэта суб'ект-аб'ектная канструкцыя, дзе суаднесенасць гістарычнага наратыву з актуальным досведам успрымання мінулага азначае дасягненне гістарычнай праўды. У якасці базавай тэарэтычнай схемы прапануецца метафізічна-дынамічная мадэль. Гэтыя высновы зноў вяртаюць нас да Суб'екта, які зараз набывае статус абавязковага элемента самой мадэлі гісторыка-філасофскага апісання.

## Уводзіны

Нацыянальная філасофія Беларусі сёння з'яўляецца адным з найважных элементаў айчыннай духоўнай культуры. У сучасных умовах яна ўяўляе сабою дысцыплінарна афармлены феномен, які абапіраецца на вызначаныя традыцыі даследавання, мае грамадскае прызнанне і сваё ўласнае прадметнае поле – гісторыя філасофіі Беларусі, метадалогія і практыка даследавання. У гэтай галіне ведаў напісаны дзясяткі манаграфій і, напэўна, сотні артыкулаў, абараняюцца кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, праводзяцца канферэнцыі і іншыя навуковыя форумы. І тут, акрамя традыцыйнай цікавасці з боку розных пластоў насельніцтва да мінулага ўступаюць у гульню больш істотныя фактары. Ва ўмовах станаўлення беларускай дзяржаўнасці развіццё нацыянальнай філасофіі цесна ўвязана з шырэйшым праектам сцвярджэння адпаведнай нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, якая на розных этапах свайго развіцця патрабуе гістарычнага пацверджання і філасофскага абгрунтавання.

Гэта кароткае апісанне актуальнасці адначасова можа лічыцца і вызначэннем нацыянальнай філасофіі, якое, праўда, даецца ў максімальным абстрактным дэскрыптыўным парадку. Сапраўды, любы феномен можа быць апісаны праз характар яго функцыянавання ў той ці іншай сацыяльнай сістэме ці праз значныя індыкатары, якія робяць яго вядомым у тым ці іншым асяроддзі.

Тым часам пры досыць высокім узроўні развіцця той ці іншай навукі ўзнікае спакуса даць адказ на пытанне ўжо сутнаснага характару, якое ў нашым выпадку будзе гучаць так: «Што ёсць нацыянальная філасофія?», – а гэта патрабуе канцэптуальнага апісання той формы прырашчэння ведаў, якую прапануе гэта дысцыпліна. У максімальна шырокім абагульненні падобны падыход можна назваць тэорыяй дысцыпліны. Калі прыняць да ўвагі апрыёрную тэарэтычнасць самой філасофіі пры практычна поўнай адсутнасці ў яе структуры эмпірычных і эксперыментальных ведаў тэорыю гісторыі філасофіі карэктней будзе зваць метатэорыяй ці тэорыяй тэорыі. Па сутнасці, пабудова такой метатэорыі будзе пачынацца з кароткачасовага выйсця за дысцыплінарныя рамкі гісторыі як філасофіі Беларусі, так і філасофіі ўвогуле для максімальна дакладнага схоплівання сутнасці нацыянальнага філасофскага працэсу. Гэта значыць, прапану-

*Артыкул падрыхтаваны пры падтрымцы Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (праект Г14-099 «Когнитивное пространство Восточной Европы: историческая динамика центров инкультурации и трансграничного взаимодействия»).

ючы тэзіс, што «гісторыя філасофіі Беларусі» сапраўды ёсць філасофія, мы павінны не толькі знайсці для яе месца ў агульным кампендыуме філасофскіх ведаў, але і тэарэтычна ўпісаць айчынны філасофскі працэс ва ўніверсальную сістэму філасофіі.

«La généalogie est grise; elle est méticuleuse et patiemment documentaire. Elle travaille sur des parchemins embrouillés, grattés, plusieurs fois récrits» (Генеалогія падобная да шэрай штрыхоўкі, нанесенай на паперу. Ёй уласцівы скрупулёзнасць і цярплівая дакументальнасць, работа на пергаменце, што заблытвае думку сваёй скрэсленасцю і шматразовым перапісваннем) [1, с. 145]. Сапраўды, сталая філасофская традыцыя нечым падобная да таго сярэднявечнага пергаменту або старажытнага абраза, калі на нейкую матэрыяльную аснову паслядоўна слой за слоем наносяцца ўсё новыя выявы, раздзеленыя больш або менш працяглымі прамежкамі, прычым кожны новы слой прэтэндуе не на негацыю, а на паляпшэнне папярэдняга. Маючы перад сабою такую традыцыю-абраз, можна абраць некалькі стратэгій для работы з ёй. Першае і, мабыць, самае простае – зрабіць нейкую копію, перанёсшы ўбачанае на новы ліст. Падчас «знаходжання» ў традыцыі звычайна ўзнікае спакуса падмаляваць у агульным ансамблі дэталі, якіх нібы не хапае, або адрэтушаваць уяўныя або яўныя пацёртасці. У тым сэнсе, што ўкладае ў сваю метафару Фуко: праца гісторыка філасофіі можа быць у нечым падобная да працы рэстаўратара, які слоем за слоем знімае наноснае з абраза, спрабуючы такім чынам «дакапацца» да самай старажытнай выявы, якая апрыоры лічыцца найбольш каштоўнай. Відаць, на гэтым і заканчваецца падабенства паміж місіяй мастака-рэстаўратара і гісторыка філасофіі, паколькі ў нас, вядома, няма ўпэўненасці, які слой больш важны і каштоўны. Па сутнасці, рэканструкцыя агульнай карціны гісторыі філасофскай думкі Беларусі – гэта паказ яе ў выглядзе пэўнай галерэі, палотнаў, якія з большай або меншай ступенню ўмоўнасці могуць быць аб’яднаныя агульнай тэмай, але выкананыя зыходзячы з розных традыцый, стыляў, задач і інтэнцый. Больш таго, падобная агульная карціна, якую максімальна абагульнена можна назваць гісторыка-філасофскім працэсам, у Беларусі ўсё ж мае кумулятыўны характар, калі элементы папярэдніх дасягненняў, праінтэрпрэтаваныя ўжо з пазіцый новай генеалогіі, становяцца цаглінкай чарговай карціны, якая ўваходзіць у галерэю, што называецца гісторыяй беларускай філасофіі.

І толькі пасля правядзення гэтай працы мы, як бы вяртаючыся назад, можам прыступіць ўжо да разумення ўнутранай структуры нацыянальнай філасофіі, абагульнення існуючых ўнутры яе практык працы з мінулым, а таксама эксплікацыі канцэптуальна і тэарэтычна ўсяго працэсу разгортвання духу філасофіі на нашых землях. Схопліванне сутнасці, разуменне структуры, абагульненне практык і канцэптуальнае апісанне працэсу разгортвання нацыянальнага духу і будуць найважнейшымі кампанентамі метатэорыі нацыянальнага гісторыка-філасофскага працэсу.

Наша даследванне робіць спробу пазіцыянаваць сябе менавіта як філасофскую работу і зыходзіць з таго, што гэты філасофскі аналіз павінен быць накіраваны не на загадзя няпоўную аб’ектывацыю мінулага, але на актуалізацыю нашага канкрэтна-гістарычнага досведу таго, што сышло, але засталося дарагім. З такога пункту гледжання наша бачанне «гісторыі філасофіі і Беларусі» – гэта двухсастаўная суб’ект-аб’ектная канструкцыя, дзе суаднесенасць гістарычнага наратыву з актуальным для чытача «досведам зносін» ці ўспрыманнем мінулага азначае дасягненне гістарычнай праўды. Менавіта фарміраванне вакол генеалогіі традыцыі філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі стварае адпаведнае навуковае поле, якое з’яўляецца сімбіёзам адміністрацыйнай, інтэлектуальнай і культурнай улады. Гэтае ж поле закладвае базавыя падставы легітымацыі саміх атрыманых ведаў праз варыянты разумення гістарычнага досведу для інтэлектуальнай дынамікі культуры Беларусі.

Менавіта ў гэтых межах мы і канцэнтруемся на нейкай першаснай перадумоўленасці гісторыка-філасофскага працэсу ў Беларусі, якая можа быць эксплікавана праз

магчымую лагічную і ў некаторай ступені метафарычную структуру. У гэтым, метадалагічным, дачыненні наш падыход да тэорыі гісторыка-філасофскага працэсу антрапацэнтрычны, пры якім увага засяроджваецца не на пошуку нейкіх знешніх схем ужо нібы закладзеных унутры схопліваемага феномена або даследуемага падтыпу філасофіі, але на эксплікацыі як рэалізаваных, так і патэнцыйна магчымых праграм канцэптуалізацыі гістарычнага матэрыялу ўнутры пэўнай навуковай праграмы, у тым ліку і як спосаб выяўлення суб'ектам значэння аб'екта для свайго суб'ектнага быцця [2, с. 53]. Таму ў зададзенай схеме пэўнай сінергіі суб'екта і аб'екта дынамічнасць надаецца двум кампанентам гэтай канструкцыі. А гэта азначае, што не толькі тое, што схопліваецца, мае сваю гісторыю, але і сам суб'ект гістарычны і таму дынамічны.

Развіццё гісторыка-філасофскай сістэмы, як правіла, праходзіць чатыры асноўныя стадыі, якія выдатна ілюструюцца, напрыклад, пры аналізе станаўлення антычнай гісторыі філасофіі. Першую стадыю можна з пэўнай доляй умоўнасці суаднесці з працай «Пра жыццё, вучэнні і выказванні знакамітых філосафаў» Дыягена Лаэртскага (якая ўяўляе сабой збор біяграфіяй выдатных грэчаскіх філосафаў) [3], другую – з даксаграфіяй Дыльса [4; 5], якая (магчыма, на шкоду храналагічнай справядлівасці) здольна рэалізавацца ў нейкія тэарэтыка-рацыяналістычныя канструкцыі, падобныя да гісторыі філасофіі Гегеля. Пасля першага падвядзення вынікаў пачынаецца працэс, які можна назваць чацвёртым, або крытычным, перыядам у развіцці гісторыі філасофіі, калі існуючы ўзор падпадае пад пераасэнсаванне, рэканструкцыю і нават адмаўленне. Прымяняючы гэту схему пры аналізе станаўлення айчыннай гісторыі філасофіі, мы можам убачыць падобенства. Першыя этапы станаўлення беларускай нацыянальнай самасвядомасці зафіксавалі шэраг больш або менш легендарных упамінанняў пра тых ці іншых дзеячаў культуры, якія зрабілі свой унёсак у беларускую духоўную гісторыю (першая згадка Максіма Багдановіча пра беларускае Адраджэнне [6]). Пасля мы можам назіраць этап назапашвання аўтэнтычных фрагментаў [7] і, нарэшце, з'яўленне абагульняючых работ, якія прэтэндуюць на комплекснае тэарэтычнае асэнсаванне айчыннага гісторыка-філасофскага працэсу.

Якім чынам можа быць апісана мінулае думкі? Відавочна, што ў адрозненне ад гісторыі матэрыяльнай, калі перад тварам даследчыка ляжыць нейкі аскепак мінулага часу, думка не можа існаваць без свайго носьбіта. Прычым (як гэта бывае ў гісторыі) сапраўдны носьбіт думкі часта з натуральных прычын недаступны для рэпрэзентацыі. У большасці выпадкаў аб'ектам вывучэння выступае тэкст. Ён у максімальна шырокім значэнні можа быць разгледжаны ў трох плоскасцях. Па-першае, мы можам казаць пра аўтара тэксту, па-другое – пра чытача, слухача або пра інтэрпрэтатара [8, с. 110−119]. Па-трэцяе, нельга не браць пад увагу і сам тэкст, які нават без уліку спецыяльна закладзенага ў яго сэнсу, мае шматслойныя канатацыі [9]. Аўтар, якому праз дзесяцігоддзі, а часта і праз стагоддзі будзе наканавана стаць прадстаўніком беларускай філасофіі, тварыў у свой час і на сваёй мове. Прычым паняцце мовы тут відавочна не можа быць абмежавана яе традыцыйным школьным разуменнем як нейкай граматычнай і сінтаксічнай канвенцыі. Мова ў больш шырокім разуменні разам з граматычнай структурай уключае ў сябе пэўны сэнсавы рад, гэта значыць набор нейкіх умоўнасцей і недагаворанасцей, зразумелых і прынятых у адну эпоху, але і недаступных для эпохі іншай [10]. Пераклад гэтага сэнсу на сучасную мову (на двух узроўнях яе разумення: мова, на якой мы гаворым, і як сучасная метамова) і складае аснову інтэрпрэтацыйнай работы. Мы ўжо казалі, з аднаго боку, пра ўзроўні інтэрпрэтацыі [8, с. 119−130]. Асобны тэкст, творчая эвалюцыя філосафа, сацыякультурная карціна той або іншай эпохі, а таксама духоўная дынаміка нацыянальнай або цывілізацыйнай фармацыі ў цэлым уяўляюць сабой складанае перапляценне шматстайных разнавіднасцей інтэрпрэтацый, аб'яднаных вакол рашэння вузкага кола пытанняў, якія адносяцца да асноў светабудовы.

Для традыцыі любая гісторыка-філасофская тэма з’яўляецца правамернай і заканамернай. Ва ўсіх выпадках падобная і структура навуковага пошуку. Прафесійна гісторык філасофіі разглядае розныя віды спекулятыўных канструкцый ад самых простых (філасофскі тэкст) да найбольш складаных (духоўная гісторыя чалавечай цывілізацыі). Даследуюцца перадумовы ўзнікнення таго або іншага філасофскага феномена, навацыі, прынесеныя падчас яго стварэння, значэнне зробленага для будучыні. Вялікае месца ў працы гісторыка філасофіі займае таксама вытлумачэнне або нават перавытлумачэнне тэксту, створанага яго папярэднікамі для таго, каб гэты тэкст быў зразумелы сучаснікам.

Перш за ўсё трэба вылучыць так званы мікраўзровень, калі аб’ект зацікаўлення бярэцца максімальна канкрэтна. Але навука па сутнасці немагчыма без абагульненняў або без наяўнасці тэарэтычнага ўзроўню. І нарэшце, для выкладання пэўных ведаў неабходна сістэматычнасць. Што тычыцца сістэматычнасці, то на гэтым жа высокім узроўні прадугледжваюцца як прыватныя звязкі, так і нейкая глабальная характарыстыка, якая працягваецца праз увесь мегааб’ект даследавання. Прычым у гэтым працэсе сам характар гэтай лагічнай звязкі не абавязкова цесна кагерыруе з сутнасцю навуковага прадмета, у рамках якога тлумачыцца той або іншы аб’ект. Часта яго дэтэрмінуюць тая сучаснасць, у якой стварае філосаф, яго перакананні, перажыванні і не ў апошнюю чаргу знешняе атачэнне – ментальнае і нават фізічнае. «Іншымі словамі, у “аб’ектыўнай” гісторыі “рэальнасць” заўсёды ўяўляе сабой толькі нефармулюемае азначаемае, якое хаваецца за ўяўнай усемагутнасцю рэферэнта» [11, с. 439]. (Для параўнання – [12]).

Акрамя гэтага, гістарычны аповед, зроблены на мегаўзроўні навукі, прадугледжвае перыядызацыю. Па-першае, падзеі павінны ісці ў строгай або не строгай лагічнай падпарадкаванасці. Па-другое, маюцца на ўвазе пошукі нейкіх каўзальных сувязей паміж феноменамі, а па-трэцяе (і гэтага перш за ўсё патрабует тэкст, а не сам прадмет), неабходны падзел матэрыялу на пэўныя ўнутрана закончаныя наратывы высокага ўзроўню. Калі ў навуковай працы гэта будуць главы, раздзелы, параграфы, то апісанне гістарычнага аб’екта мае патрэбу ў перыядах, эпохах, а часам – у цывілізацыях.

Даўно ўжо абмяркоўваецца пытанне аб заганнасці любой перыядызацыі. Вучоны пры ажыццяўленні такой работы міжволі бярэ на сябе функцыі Бога. Бог стварыў час, мы бярэм на сябе смеласць дзяліць яго, ствараць эпохі і іншыя больш або менш значныя прамежкі часу. Адпраўнік дыскурсу выключае з яго сваю эмацыйную асобу, затое замяняе яе іншай, «аб’ектыўнай» асобай; суб’ект цалкам захоўваецца, але як аб’ектыўны суб’ект [11, с. 431]. Для таго, каб штосьці вылучыць з нейкага шэрагу неўпарадкаванага, а часта і несвядомага, спачатку трэба знайсці агульнае, што гэты шэраг аб’ядноўвае. Калі разглядаць класічны катэгарыяльны шэраг, то эпохі ў гісторыі аб’ядноўвае тое, што называецца сутнасцю, а раз’ядноўвае нешта прыватнае, што мае якасці, уласцівыя з’явам. У прынцыпе ужо на гэтым пачатковым узроўні відавочна, што, як любая класіфікацыя, перыядызацыя – вынік чалавечага розуму, а не твор рэчаіснасці [13].

Вядомае філасофскае пытанне «што ёсць чалавек?» немінуча выклікае і наступнае: што галоўнае ў чалавеку – матэрыяльнае або духоўнае, пачуццёвае або рацыянальнае, сацыяльнае або інтымна-асабістае? Чарговае пытанне «ў чым сэнс зямнога існавання чалавека?» таксама накладае свой адбітак на даследуемую намі праблему перыядызацыі. Таму што адказы сабе самому на кардынальныя пытанні, якія папярэднічаюць канкрэтнай рабоце любога гісторыка філасофіі, дазваляюць яму, у канчатковым выніку, вылучаць галоўнае і негалоўнае ў чалавечай гісторыі, а гэта значыць, ствараць саму гісторыю – эканамічную, палітычную, духоўную.

Гісторыя філасофіі ў гэтых адносінах хутчэй не выключэнне, а правіла. Прыярытэт рацыянальнага, непрытоены піетэт перад спекулятыўнымі формамі засваення рэальнасці настройвае спецыфіку гісторыі з філасофскага пункту гледжання. З гэтай па-

зіцыі можа быць часткова вытлумачаны і той феномен, што паралельна з развянчаннем розуму як Спадара Універсума, увядзеннем у якасці новых дэтэрмінантаў асабістага і грамадскага жыцця ірацыянальнага і несвядомага, філосафы загаварылі пра канец гісторыі, прыярытэт паўсядзённасці, бессэнсоўнасці чалавечага існавання. Атрымліваецца, што несвядомае адмяняе перыядызацыю або падае варыянт нулявой перыядызацыі.

Любы апавядальнік (або проста глядач гісторыка-філасофскага спектакля) існуе звычайна ў межах двоістай сітуацыі. З аднаго боку, над намі непазбежна пануе іманентнае і індывідуальнае адчуванне мінулага; з іншага боку, мы знаходзімся ў нейкіх знешніх рамках міфа, а ў выпадку пабудовы даследавання – і ў абдымках навуковага поля, у якім адбываецца тое ці іншае ўзаемадзеянне з традыцыяй. Што да той рэальнасці, пра якую мы пішам, то яна знаходзіцца перад намі ўжо ў траістым стане. Па-першае, гэта менавіта канкрэтнае мінулае, што цікавіць нас; па-другое, яно недаступнае для поўнага спасціжэння; па-трэцяе, яно ніколі цалкам не верыфікуемае.

Чыстая эпістэмалагічная сітуацыя – гэта, калі перада мною Я як суб’ект, што спазнае, і мінулае як аб’ект пазнання. І пра першае, і пра другое можна распавесці якую-небудзь гісторыю. Прычым, кажучы словамі Гусерля, амаль заўсёды абсалютна цёмную [14, с. 19]. З пункту гледжання гістарычнай сацыялогіі гэта таксама з’яўляецца праявай таго, што Фрэдэрык Джеймісан называе «палітычным несвядомым» [15]. Па не да канца эксплікуемых сцяжынках з мінулага (Pfadabhängigkeit [16], path dependence [17; 18]) гістарычны досвед [19] пранікае на ўзровень ідэалагем і такім чынам уплывае на ўсю палітычную сацыяльную і духоўную дзейнасць.

У кантэксце нашых спроб спасціжэння сутнасці філасофскага працэсу ў Беларусі заслугоўвае ўвагі мадэль, што актыўна выкарыстоўваецца ў амерыканскай філасофіі і прадугледжвае нейкі сінтэз метафізікі і дынамікі. Гэта значыць, мы можам казаць пра своеасаблівы статычны вобраз рэчаіснасці, дзе аб’екты замяняюцца ізаляванымі адзін ад аднаго працэсамі [20; 21]. Такая дыялектыка статычнасці і дынамічнасці найперш з’яўляецца апраўданай рэакцыяй на складанасць таго свету, што паўстае перад вачыма сучаснага даследчыка. Сапраўды, як наш Універсум (макракосм), так і мікракосм у вобразе чалавека заведама татальны і глабальны. Гэтыя высновы зноў вяртаюць нас да Суб’екта, які цяпер аказваецца абавязковым элементам самой мадэлі гісторыка-філасофскага апісання.

І зноў жа гэтая абавязковасць абумоўлена не нейкімі, магчыма, нават тагасветнымі сіламі, а менавіта гістарычным развіццём усіх філасофскіх ведаў наогул і той парадыгмы, што выступае ў якасці своеасаблівага міфа, які нібы ахінаюць нашай пазнавальнай дзейнасцю. Сапраўдны навуковы пошук – гэта адначасова і неардынарна моцны эмацыйны парыў, выкліканы ў тым ліку і апрыёрным адчуваннем няўтульнасці перад тварам кагнітыўнай сферы, што раптоўна раскрылася. Супакаенне праз задаволенасць вынікамі работы азначае, што мы ў чарговы раз (магчыма, ужо на якасна іншым узроўні) дасягнулі кагерэнтнасці са сваім унутраным міфам.

Вяртаючыся да вышэйадзначанай прадуктыўнасці метафізічна-дынамічнай мадэлі [20; 21], варта падкрэсліць, што гэты бясспрэчна рэдукцыяніскі падыход, прынамсі, пры аналізе сацыяльнай рэальнасці напрамую карэлюецца з самой прыродай чалавека (а ў больш вузкім значэнні – філосафа або вучонага). Рэальная канечная сутнасць асобы і абмежаваныя ў часе любыя пазнаваўчыя намаганні, відаць, і з’яўляюцца рэальнай мяжой экспансіі дынамічнай мадэлі менавіта не як абстрактнай філасофскай тэорыі, а рэальнага метадалагічнага інструмента. Аднак у гэтым кантэксце неабходна ўлічваць і іншы важны напрамак дынамічнага «расхіствання» метафізікі сацыяльнага свету. Мы ўжо адзначалі, што ў філасофіі мысліцель з’яўляецца не староннім назіральнікам, але актыўным дзеячам па канструяванні як самой сваёй сутнасці (у нашым выпадку – вучонага-даследчыка), так і ўсяго свайго дыскурсу ўжо не над знешнім, а над ней-

кім прамежкавым (інтэрсуб'ектыўным?) аб'ектам. Больш таго, Яго ці Яе Вялікасць Аўтар сам займае ў тэксце хаця і не заўсёды выразна акрэсленае, але сваё ганаровае месца.

**Заключэнне**

Прымаючы вышэйназваныя палажэнні пры напісанні (а гэта значыць адначасова і пабудова, і канструяванне) цэласнай карціны гісторыі філасофіі, мы найперш павінны паклапаціцца пра саму цэласнасць, якая разумеецца ўжо не ў звычайнай канатацыі яе як нейкага поўнага і ўсеахопнага тэксту, але менавіта максімальна магчымай канцэптуальна афармленай канструкцыі. Так метатэорыя ператвараецца ў метадалагічную праграму, якая, з аднаго боку, здольная вытлумачыць усе нашы далейшыя дзеянні, а з іншага – стаць тым канцэптуальным субстратам, з якога ўсе далейшыя выкладкі маглі б вынікаць. І калі атрыманыя вынікі «акажуцца неадэкватнымі, яны павінны, прынамсі, мець пазнавальны ападыктычны змест, быційны змест, які ў выніку гэтай ападыктычнасці гарантаваны раз і назаўсёды, гэта значыць з абсалютнай надзейнасцю» [14, с. 14].

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Foucault, M. Nietzsche, la genealogie, l'histoire / M. Foucault // Hommage a Jean Hyppolile. – Paris, 1971. – P. 145–173.

2. Каган, М.С. Философская теория ценности / М.С. Каган. – СПб. : Петрополис, 1997. – 205 с.

3. Diogenes, Laertius. Lives of eminent philosophers : in 2 vol. / Diogenes Laertius. – London, New York : W. Heinemann; G.P. Putnam's sons, 1925. – Vol. 1–2.

4. Diels, H. Die Fragmente der Vorsokratiker: griechisch und deutsch / H. Diels. – Berlin : Weidmann, 1903. – 601 s.

5. Diels, H. Doxographi graeci / H. Diels. – Berolini : de Gruyter, 1958. – 854 s.

6. Багдановіч, М. Беларускае адраджэнне / М. Багдановіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1994. – 31 с.

7. Из истории философской и общественно-политической мысли Белоруссии : избр. произведения XVI – начала XIX вв. / ред. В.А. Сербента. – Минск : Изд-во Акад. наук БССР, 1962. – 524 с.

8. Евароўскі, В.Б. Гісторыя філасофскай і грамадска-палітычнай думкі Беларусі : у 6 т. / В.Б. Евароўскі [і інш]. – Мінск : Беларуская навука, 2008. – Т. 1. – 540 с.

9. Barthes, R. Le bruissement de la langue / R. Barthes. – Paris : Seuil, 1984. – 412 p.

10. White, H.V. The content of the form : narrative discourse and historical representation/ H. White. – Baltimore : Johns Hopkins University Press, 1990. – 244 p.

11. Барт, Р. Дискурс истории / Р. Барт ; пер. С.Н. Зенкина // Система Моды. Статьи по семиотике культуры. – М. : Изд-во им. Сабашниковых, 2003. – С. 427–441.

12. Bourdieu, P. Le sens pratique / P. Bourdieu. – Paris : Éditions de Minuit, 1980. – 475 p.

13. Barthes, R. Le discours de l'histoire / R. Barthes // Social Science Information Social Science Information. – 1967. – T. 6. – № 4. – P. 63–75.

14. Husserl, E. Méditations cartésiennes, introduction à la phénoménologie, par Edmond Husserl. Traduit l'allemand par Mlle Gabrielle Peiffer et M. Emmanuel Levinas / E. Husserl. – Paris : Vrin (Mayenne, impr. de J. Floch), 1953. – 136 p.

15. Jameson, F. The political unconscious: narrative as a socially symbolic act / F. Jameson. – Ithaca, N.Y. : Cornell University Press, 1981. – 305 p.

16. Beyer, J. Pfadabhängigkeit ist nicht gleich Pfadabhängigkeit! Wider den impliziten Konservatismus eines gängigen Konzepts / J. Beyer // Zeitschrift für Soziologie. – 2005. – T. 34. – № 1. – S. 5–21.

17. Liebowitz, S.J. Path dependence, lock-in, and history / S.J. Liebowitz, S. Margo-

lis // Journal of Law, Economics & Organization. – 1995. – P. 205–226.

18. Mahoney, J. Path dependence in historical sociology / J. Mahoney // Theory and society. – 2000. – Т. 29. – № 4. – P. 507–548.

19. Ankersmit, F.R. Sublime historical experience/ F.R. Ankersmit. – Stanford : Stanford University Press, 2005. – 481 p.

20. Seibt, J. Process theories: Cross-disciplinary studies in dynamic categories / J. Seibt. – Springer, 2003. – 336 p.

21. Dupré, J. Processes of life : essays in the philosophy of biology / J. Dupré. – Oxford ; New York : Oxford University Press, 2012. – 350 p.

22. Bell, D. A Total History and Microhistory / D. Bell // A Companion to Western Historical Thought. – 2002. – P. 262–276.

23. Muir, E. Microhistory and the lost peoples of Europe / E. Muir, G. Ruggiero. – Baltimore : Johns Hopkins University Press, 1991. – 204 p.

24. Петрухин, П.В. Русский плюсквамперфект в типологической перспективе / П.В. Петрухин, Д.В. Сичинава // Вереница литер. К 60-летию В.М. Живова. – М. : Языки славянской культуры, 2006. – Т. 60. – С. 193–214.

***Yevarouski V.B.*** **Metatheory National Philosophy of Belarus**

The article summarizes the results of studies on the general theory creation (metatheory) of national philosophy of Belarus. Nowadays, this branch of the humanities is a discipline-designed phenomenon that has public recognition, traditions of research, its own subject area – «History of Philosophy of Belarus», methodology and practice of research. Thus, the problem of conceptual description of the form of the increment of knowledge which is offered by this discipline has become urgent. It is assumed that the definition of the essence, understanding the structure of the discipline, summarizing practices of learning will be essential elements of this metatheory. Therefore, «the national philosophy of Belarus» is a subject-object structure, where the correlation of historical narrative with the actual experience of perception of the past is the achievement of historical truth. As a basic theoretical framework metaphysical-dynamical model is proposed. These findings again bring us back to the Subject, which now acquires the status of an essential element of the model of historical and philosophical description.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 01.09.2014